Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

ГАСЦІНЕЦ

Далучайся!

№ 17 (333) ЛІСТАПАД 2022 ГОДА

БЕЛАРУСКІЯ ПАВУЧАННІ

Трэба розумам надтачыць, дзе сіла не возьме

КУЛЬТУРА

«ПРЫДЗВІНСКІЯ КАРУНКІ» Ў 10 РАЗ

26 лістапада 2022 года ў Гарадоцкім гарадскім Доме культуры адбыўся Хагляд-конкурс харэаграфічных калектываў «Прыдзвінскія карункі». У конкурсе па традыцыі прынялі ўдзел вядучыя харэаграфічныя калектывы народна-сцэнічнага, эстраднага танца, а таксама харэаграфічныя калектывы з найменнем «народны», «узорны» і званнем «заслужаны» з усёй Віцебшчыны.



Калектывы спаборнічалі ў наступных намінацыях:

-«На лепшае выкананне аўтарскіх танцаў Заслужанага дзеяча культуры Беларусі І.А. Серыкава»,

-«На лепшую новую балетмайстарскую пастаноўку беларускай накіраванасці»,

-«На лепшы народны танец, у якім павінна быць адлюстравана нацыянальная тэматыка, нацыянальныя матывы»,

-«На лепшы эстрадны танец, у якім павінна быць адлюстравана народная тэматыка, нацыянальныя матывы».

Усяго ў аглядзе-конкурсе прыняла ўдзел больш 30 харэаграфічных калектываў з агульнай колькасцю больш 500 чалавек пасля папярэдняга відэаадбору ўдзельнікаў. У праграме было заяўлена 100 конкурсных нумароў.

Прайшоў таксама майстар-клас для ўдзельнікаў і кіраўнікоў калектываў па творчай спадчыне І.А.Серыкава.

Пасля конкурснай праграмы адбыўся канцэрт ансамбля танца, музыкі і песні «Талака» Віцебскай абласной філармоніі.

Пастаянным месцам правядзення абласнога мерапрыемства 1 раз у 2 гады з'яўляецца г.Гарадок. У 2018 годзе агляд-конкурс адбыўся ў восьмы раз у Віцебску з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння Заслужанага дзеяча культуры Беларусі І.А. Серыкава.

Агляд-конкурс праводзіцца з мэтай папулярызацыі, аднаўлення і захавання беларускага народнага танца, танцавальнай спадчыны Заслужанага дзеяча культуры Беларусі І.А. Серыкава; павышэння ўзроўня выканаўчага майстэрства ўдзельнікаў харэаграфічных калектываў і папаўнення іх рэпертуару.

Арганізатарамі агляду-конкурсу выступаюць: упраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама, дзяржаўная ўстанова «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці», аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гарадоцкага райвыканкама.

Л. Антонаў

ПАЖАР

ПАБУДОВА ЗНІШЧАНА ПАЖАРАМ

У Гарадоцкім раёне за апошнія 24 гадзіны на пажары знішчана пабудова.

Паводле інфармацыі прэс-службы Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС ў Віцебскай вобласці за апошнія суткі адбыўся толькі адзін пажар. І гэта адбылося ў Гарадоцкім раёне.

Са сціслай інфармацыі абласной прэс-службы ўпраўлення МНС вядома, што ў Гарадоцкім раёне знішчана пабудова ў перыяд з 6 раніцы 20 лістапада па 6.00 21 лістапада. Знішчэнне азначае, што ратавальнікі прыбылі на месца пажара, калі ўсё згарэла. Гэта магчыма дом, хлеў або лазня. Або гэта штосьці іншае.

Калі каму-небудзь з нашых чытачоў вядома пра гэта знішчэнне пабудовы, то паведаміце на тэл. +375296723842 ў Тэлеграме або ў сацыяльных сетках. У гэтым выпадку інфармацыю дапоўнім.

Т. Гаражанка

ЗНАЧНА БОЛЬШ НАВІНАЎ ПРА ГАРАДОК НА HARADOK.INFO

ДЭМАГРАФІЯ

ВЁСКІ СТРАЦІЛІ, А ГОРАД ЗАХАВАЎСЯ

У Гарадоцкім раёне тэмпы скарачэння насельніцтва адны з самых нізкіх у вобласці для раёнаў, дзе больш 20 тысячаў жыхароў. Пры гэтым у нашым раёне больш 60% насельніцтва пражывае ў Гарадку і Езярышчы. Гэта з'яўляецца другім паказчыкам на Віцебшчыне пасля Чашніцкага раёну з горадам энергетыкаў — Навалукомлем. . Пра гэта сведчаць апошнія даныя са штогадовага зборніка «Статыстычны зборнік Віцебскай вобласці. 2021 год».

Паводле афіцыйных даных Віцебскага абласнога ўпраўлення статыстыкі ў Гарадоцкім раёне ў 2022 годзе на 1 студзеня пражывала 21 117 жыхароў. Адпаведна ў Гарадку была 12 717 жыхароў, у г.п. Езярышча 1 088 жыхароў. Пры гэтым яшчэ на 1 студзеня 2015 году ў раёне жыла 23 654 чалавека, з якіх у Гарадку — 11932, г.п. Езярышча — 1 302. Простая арыфметыка сведчыць, што за шэсць гадоў насельніцтва скарацілася крыху больш за 2500 чалавек.

Сярод васьмі сельскіх раёнаў Віцебшчыны, дзе ў 2015 годзе было больш 20 тысяч жыхароў, гэта самае малае скарачэнне насельніцтва. Мусіць таму, што ў гэтыя гады ў Гарадку актыўна будаваліся крамы, прыцягваліся інвестары, развівалася спартыўна-турыстычная інфраструктура, а культурныя ўстановы з моцнымі мастацкімі калектывамі гучаць на ўсю краіну.

Ды і Гарадок з'яўляецца прыгарадам Віцебска, што вельмі істотна пры добрым транспартным злучэнні з абласным цэнтрам.

У 2022 годзе ў трох раёнах Віцеб-шчыны стала менш 20 тысяч. Гэта ў Верхнядзвінскім, Мёрскім, Сененскім раёнах, адпаведна па 19 518, 18 358 і 19 694 жыхароў. Найбольш страціў Сененскі раён — амаль 3 500 жыхароў.

Іншыя раёны 20-тысячнікі страцілі насельніцтва больш 2500 жыхароў: Браслаўскі — 2 784, Докшыцкі — 2883, Талачынскі — 3165, Чашніцкі — 3 883. Пры гэтым Чашніцкі раён выбыў з групы раёнаў за 30 тысяч жыхароў. Праўда сярод урбанізаваных раёнаў ён на першым месце, бо калі ў Чашніках пражывае 7473 жыхара, то ў горадзе энергетыкаў Нава-лукамлі — 12 250. Адпаведна працэнт гарадскога насельніцтва ў раёне — 73,0%.

У Гарадоцкім раёне працэнт гарадскога насельніцтва — 60,2%. Сярод іншых раёнаў нашай групы гэты паказчык істотна менш. Толькі яшчэ Пастаўскі раён мае 68,1% гарадскога насельніцтва, але тут тры гарадскіх мястэчка — Паставы, Варапаева і Лынтупы.

Вось такая дынаміка змяншэння насельніцтва і сітуацыя з урбанізацыяй раёнаў Віцебскай вобласці па выніках афіцыйных статыстычных даных за 2021 год.

Лявон Гаравы

Паводле даных: vitebsk.belstat.gov.by

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

КАК С МОЛОКОМ В РАЙОНЕ?

За восемь месяцев 2022 года поголовье коров в Витебской области сократилось на 5000 животных. Про это пишут «Народныя навины Витебска». Сообщаем, как ситуация с поголовьем коров и молоком в Городокском районе.

На начало года в сельскохозяйственных организациях северного региона Беларуси насчитывалось 188 200 коров, а к началу осени осталось только 183 200 буренок.

Самое катастрофическое сокращение коровьего стада на Витебщине произошло весной, однако, и летом, в разгар пастбищного сезона, выбытие животных продолжилось и ежемесячное сокращение составляло по 200 голов.

На 1 сентября 2022 г. в сельскохозяйственных организациях смогли надоить 515 100 тонн молока, что на 6,2% меньше прошлогодних результатов.

Все поголовье КРС Витебщины на 1 сентября насчитывало 522 000 животных, за три летних месяца оно сократилось на 2100, только за август — на 1700. Так написал Сяржук Серабро в «ННВ».

От себя отметим, что сокращение поголовья коров привело и к уменьшению сданного молока на Витебщине до 546 074 т или 96,7% от прошлогоднего уровня сдачи молока. Да и надои в среднем от коровы стали меньше в области на 2% — 3039 кг за девять месяцев.

А как с коровами и молоком в Городокском районе?

Сейчас нам выявить динамику изменения количества коров в Городокском районе в 2022 году в открытых статистических источниках не получилось. Поэтому о состоянии молочной отрасли района можно судить по другим показателях. Так за 9 месяцев этого года район сдал молока на 20 419 тонн, что только 88,8% к прошлогоднему уровню. Говоря по простому молока сдали на восьмую часть меньше, чем в 2021 году. Если бы средние удои от буренки оставались на прежнем уровне, то можно было бы говорить про сокращение поголовья.

(працяг на стар. 2)

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

(пачатак на стар. 1)

Но и средний удой составил за девять месяце 3344 кг — 87,3% от уровня 9 месяцев 2021 года. Так что всё уменьшение молока по району можно списать на падение надоев на 13,7% в этом году. Еще можно учитывать, что в Городокском районе удельный вес реализованного молока к произведенному составляет 91,3%. Это второй показатель в области после Витебского района и наравне с Оршанским, где самые высокие инвестиции в молочное производство.

Поэтому можно и не говорить, что в Городокском районе коров существенно стало меньше. К сожалению, наверное, эти данные в разрезе районов в официальной статистической информации теперь не публикуются.

Л. Антонов

По информации: viciebsk.cc

КОНКУРС

ПРИЕХАЛИ, УВИДЕЛИ И ПОБЕДИЛИ!

В преддверии Дня работников сельского хозяйства и перерабатывающей промышленности агропромышленного комплекса, с 16 по 18 ноября, на базе Белорусского государственного аграрного технического университета проходил республиканский конкурс «Агромастерство». Студенты Городокского аграрно-технического колледжа проявили себя на отлично!



Конкурс проводился среди учащихся учреждений среднего специального образования по специальности «Техническое обеспечение процессов сельскохозяйственного производства». В этом году желание побороться за звание лучших изъявили представители 16 учреждений образования, причём, не только белорусских, но и из стран ближнего зарубежья.

Знания конкурсантов проверяли в два этапа: теоретическую подготовку и практические умения. В процессе соревнования ребята мотивируются к получению профессиональных знаний, доказывают своё мастерство и способности.

Городокский колледж в столице представляли трое учащихся 4 курса: А. Богданов, В. Зайцев, В. Руколь. Наставлял ребят руководитель команды, преподаватель Н.В. Вихотенко. Также непосредственное участие в подготовке парней приняли педагоги: С.Н. Кузьмёнок, А.В. Филиппов, К.Л. Шабеко, Е.А. Савостеев. И приложенные усилия, как со стороны ребят, так и со стороны педагогов, оправдались в полной мере! По итогам двух конкурсных дней городокчане заняли 1-е место в командном зачёте, набрав 923 балла. Причём разница с результатом второго места — Полесским колледжем — была ощутимая —176 очков.

Итоги личного зачёта также впечатляют, ведь все три призовых места заняли учащиеся Городокского колледжа. 1-е место — Андрей Богданов, 2-ое — Владислав Зайцев, 3-е — Артём Руколь.

Поздравляем ребят и педагогов с заслуженной победой! Конкурс «Агромастерство» ещё раз позволил нашему аграрно-техническому колледжу заявить о себе на республиканском уровне. Это в очередной раз доказало, что в Городке готовят грамотных и знающих специалистов.

Виктория ПАВЛОВА

"Гарадоцкі веснік"

АДУКАЦЫЯ

ДЫНАМІКА АДУКАЦЫІ ЗА ШЭСЦЬ ГАДОЎ

Апошні штогадовы статыстычны зборнік «Статыстычны зборнік Віцебскай вобласці. 2021 год» у раздзеле «Адукацыя» інфармуе пра становішча з сістэмай адукацыі вобласці з 2015/2016 навучальнага года. Пра агульную сярэднюю адукацыю вядома, што вучняў у вобласці за сем гадоў стала больш на 5103 чалавека, але школ паменела на 129, а настаўнікаў на 3018. А як колькасныя справы з вучнямі, школамі і настаўнікамі за апошнія шэсць гадоў у Гарадоцкім раёне і іншых сельскіх раёнах нашага прыдзвінскага краю? Прапануем свой аналіз сітуацыі ў адукацыі, як Гарадоцкага раёна, так і Віцебшчыны.

З 2016 году колькасць вучняў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі Віцебшчыны вырасла з 110 792 вучняў да 115 895 ў 2021/2022 навучальным годзе. Гэта адбылося найперш за рост вучняў у школахВіцебска і Наваполацка і буйных па насельніцтву раёнах Аршанскім і Полацкім. Сярод сельскіх раёнаў колькасць вучняў павялічылася толькі ў Віцебскім, Лепельскім і Пастаўскім раёнах. Гэта тыя раёны якія маюць някепскія эканамічныя паказчыкі. Ва ўсіх астатніх раёнах колькасць вучняў скарацілася. Але ў Гарадоцкім раёне скарацілася не істотна: з 2111 вучня да 2031 — на 80 вучняў за шэсць гадоў. Па колькасці вучняў мы на дзевятым месцы ў вобласці, а перад намі Докшыцкі і Браслаўскі раёны, дзе за 2300 вучняў.

За справаздачны перыяд больш істотна адбылося скарачэнне школ на Віцебшчыне. Толькі ў Віцебску як было 50 школ, так і засталося ды ў Наваполацку з 17 стала 16, а ў астатніх раёнах адбылася масавая ліквідацыя малакамплектных сельскіх школ. Найбольшае скарачэнне школ адбылося ў Пастаўскім раёне. Тут закрыта 11 школ, а ў Глыбоцкім раёне — 9 школ. Па 8 школ закрыта ў Браслаўскім, Аршанскім, Талачынскім, Шаркаўшчынскім і суседнім Шумілінскім раёне. Па сем школ страцілі Дубровенскі, Лёзненскі раёны, а па шэсць наш Гарадоцкі, таксама Бешанковіцкі, Мёрскі, Сенненскі. Астатнія раёны страчвалі менш адной школы ў год, але зараз у Расонскім раёне толькі 4 школы, а ў Вушацкім — 5.

Пры гэтым адбылося масавае скарачэнне колькасці настаўнікаў ва ўсіх адміністратыўных адзінках Віцебшчыны, пачынаючы з Віцебска на 416 і г. Наваполацка на 130 педагогаў. Але больш істотна скарацілася колькасць настаўнікаў на Аршаншчыне на 299 і Глыбоччыне на 209. У Гарадоцкім раёне агулам за шэсць гадоў скарацілася на 87 працоўных месцаў настаўнікаў. Пры гэтым вылучаецца 2017/2018 год, калі ў нас быццам было толькі 184 педагога. Тады менш было толькі ў самым бязлюдным раёне — Рассонскім, дзе працавала 156 педагогаў.

Такая сумная дынаміка за апошнія шэсць гадоў з установамі агульнай сярэдняй адукацыі ў Віцебскай вобласці. На суседняй Магілёўшчыне сітуацыя не лепш. Але варта арыентавацца на лепшыя рэгіёны, а тут вылучаецца Міншчына і Гарадзеншчына.

Лявон Гаравы

Паводле даных: vitebsk.belstat.gov.by

ЗДАРЭННЕ

ГАРЭЎ ЧАРГОВЫ БУДЫНАК

Паводле інфармацыі прэс-службы Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС 30 лістапада ў Віцебскай вобласці адбылося два пажары. На пажарах гарэлі будынкі ў Гарадоцкім і Мёрскім раёнах.

Прэс-служба Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС паведаміла, што за мінулыя суткі ў населены пунктах вобласці адбыліся 2 пажары, на якіх знішчана 1 будынак, пашкоджаны 1 будынак.

Чытачы сайта могуць гадаць, што адбылося з двума будынкамі ў гэтых раёнах. У Гарадоцкім раёне будынак знішчаны ці пашкоджаны? Нічога няма пра пажар і на сайце Гарадоцкага райвыканкама, дзе асвятляецца дзейнасць ратавальнікаў. Таму калі каму-небудзь з нашых чытачоў вядома пра гэты пажар, то паведаміце на тэл. +375296723842 ў Тэлеграме або ў сацыяльных сетках. У гэтым выпадку інфармацыю дапоўнім.

Апошняя ж публікацыя на гарадоцкім сайце была зроблена яшчэ 16 лістапада і датычылася тэмы «Опасность зимнего льда». Варта з ёй азнаёміцца ЎСІМ грамадзянам, а найперш рыбакам, якія рызыкуюць заходзіць зараз на лёд.

За лістапад мясцовы прэс-цэнтр раённага аддзела МНС, дзе маецца штатны супрацоўнік, размясціў 14 публікацый пра свае справы, якія датычацца найперш прафілактыцы пажарнай бяспецы. Сітуацыя з пажарамі ў раёне за лістапад пакуль не асвятлялася. Не асвятляўся і пажар, які знішчыў пабудову ў раёне ноччу ці днём 21 лістапада. Пра гэта намі было напісана тут: haradok.info .

Варта ратавальнікам Віцебшчыны быць больш адкрытымі грамадству ў прадстаўленні інфрмацыі, якая датычыцца грамадзян, асабліва пра пажары і іншыя надзвычайныя здарэнні. Тады будзе больш цікавасці ў грамадзян да старонкі нашых ратавальнікаў.

Т. Гаражанка

КАЛЯНДАР

РОДНАЕ І ПАТРЭБНАЕ Ў КОЖНАЙ СЯМ'І

Ужо выйшаў з друку «Наш каляндар-2023» з беларускімі словамі і малюнкамі на кожны дзень.

У выдавецтве Рамана Цымберава выдадзены «Наш каляндар» на 2023 год. Каляндар дапаможа ў нязмушанай манеры вывучыць шмат беларускіх словаў, а яскравыя, пазітыўныя малюнкі падымуць настрой. На кожны дзень года — сваё, адметнае словазлучэнне на роднай мове і малюнак, які яго тлумачыць.

Каляндар будзе карысны не толькі тым, хто робіць першыя крокі ў вывучэнні беларускай мовы, але таксама ўзбагаціць слоўнікавы запас добрых знаўцаў роднай мовы.

Вось, да прыкладу, ці ведаеце вы, што такое вехцік? А жырандоля ці ветах? У календары шмат сакавітых, адметных слоўцаў на самыя розныя тэмы.

Распачынаецца каляндар касмічна-геаграфічнай тэмай. Тут ёсць назвы некаторых сузор'яў, бакоў свету, прыродных з'яваў. У лютым каляндар прапануе завітаць на кухню ды даведацца назвы посуду. У сакавіку і красавіку, як і мае быць з надыходам вясны, выходзім з хаты ў двор ды вывучаем, што навокал.

У траўні даведаемся назвы розных інструментаў, чэрвеньскі разварот календара дапаможа выправіцца ў вандроўку на роднай мове...

А якім тэмам прысвечаны іншыя месяцы, даведаецеся, набыўшы каляндар.

Яго ўжо можна знайсці ў крамах і кнігарнях:

Мінск -- інтэрнэт-кнігарні: knihi.by, tn.by, kniganosha.by, kniger.by; кнігарня «Кніжная шафа» (Дзяржынскага, 9), этнакрама «Рагна» (вул. Сухая, 4), крама «Умный кит» (Мінск, вул. Корш-Сабліна,3), ГЦ «Купалаўскі» (крама 41-42, ст.м. Кастрычніцкая).

Гродна - Крама «Цудоўня» (вул. Кірава, 3).

Бабруйск - кнігарня «Крыніцы ведаў» (вул. Горкага, 31).

budzma.me

РАСІЯ - БЕЛАРУСЬ

О НОВОЙ РЕАЛЬНОСТИ ДЛЯ РОССИИ И ЕЕ СОЮЗНИКОВ

Политический обозреватель Александр Фридман рассказал Филину о новой реальности для России и ее союзников: «Если официальный Минск продолжит участвовать в военных авантюрах Москвы, то недалек тот час, когда и Беларусь заполучит статус государства-террориста».



— Накануне Парламентская ассамблея НАТО признала Россию страной-террористом. Сегодня Европарламент большинством голосов принял резолюцию о признании РФ государством-спонсором терроризма. Что это означает для Кремля на практике — в экономическом и военно-политическом измерении?

— Я думаю, что пока речь идет о достаточно символических шагах. Но, безусловно, крайне неприятных для России. Ведь одно дело, когда тебя признают агрессором, и другое, когда ситуация выходит на новый уровень. Когда тебя фактически ставят на один уровень с группировкой ХАМАС, Хезболлой или Талибаном. Для России это очень неприятный момент.

Что касается конкретных последствий, то здесь нужно смотреть, какие решения будут приниматься на уровне национальных правительств, на уровне ЕС и США.

И, конечно же, если смотреть дальше, это еще раз подчеркивает то, что с точки зрения Европы, с точки зрения Запада никакая нормализация отношений с сегодняшней Россией невозможна. Это еще один шаг к тотальному разрыву с ней.

Ведь если ты считаешь сегодняшний российский режим террористическим, признаешь его спонсором терроризма, то какие тут могут быть разговоры?

Так что, это сильный шаг, но стоит посмотреть, какие у него будут последствия. Возможно, все так и останется на этом символическом уровне. А может, это станет толчком для каких-то решений, которые будут приниматься на уровне национальных правительств.

— Исходя из опыта стран, которые ранее удостоились этого статуса, насколько эффективна эта мера? Кроме того, в этом списке есть и те, кто его со временем покинул.

— Отмечу, что это еще и один шаг к изоляции. Ведь для тех компаний, которые все еще ведут дела с Россией, это четкий сигнал: смотрите, с кем вы сотрудничаете, это государство-террорист.

Это дополнительный прессинг в отношении тех, кто все еще рассчитывает на сотрудничество с Москвой в той или иной форме. Конечно же, это повышает давление и на Россию, и на национальные парламенты и правительства, чтобы ими принимались более жесткие решения в отношении Кремля.

Выйти из этого списка теоретически, конечно же, можно. Когда в России сменится власть, изменится политика. Но пока что это только дополнительно повышает прессинг.

Я бы здесь добавил еще один существенный момент. Тем режимам, в отношении которых раньше принимались подобные решения, было все равно. Это одиозные режимы, изгои, которые сами избрали такой путь для себя.

Все же для России это выглядит иначе. Ведь до недавнего времени она рассматривала себя в качестве части Европы, плотно сотрудничала с Евросоюзом, называла его своим партнером. До войны разговор шел о западных партнерах, а не о «коллективном Западе».

И это очень неприятная ситуация для России — когда вчерашние партнеры признают тебя террористом, сравнивают тебя с другими подобными режимами. Поэтому с ее стороны можно ожидать достаточно нервную реакцию, какие-то высказывания от Дмитрия Медведева, Марии Захаровой. Они это, безусловно, услышат и эмоционально отреагируют.

И это уже показывает, что этот выстрел Европарламента попал в цель. Я все же не считаю, что России все равно, что она готова делать все, что ей вздумается, без оглядки на мнение Запада.

У сегодняшней российской власти есть комплекс неполноценности. И им очень важно доказать, что они не хуже других, что с ними нужно вести дела. И когда сегодня террористом тебя называет не маленькая Эстония или Литва, а весь Евросоюз, то это, конечно же, больно.

— А как эти решения могут повлиять на ближайшего союзника России — Беларусь? И какой может быть реакция белорусского режима?

— Лукашенко, я думаю, и рад был бы отдалиться на определенную дистанцию, не складывать яйца в одну корзину, но такой возможности у него уже нет. Он слишком сильно привязан к России.

Реакция, если она последует, будет двухсторонней. Естественно, белорусские власти будут возмущаться. Мол, как такое возможно, что это все политика, происки Запада. Но про себя Лукашенко, наверное, порадуется тому, что Беларусь этот статус не получила.

Вот что для него сейчас главное. Ведь с таким статусом и репутацией дела совсем плохо выглядят.

На практике же это выглядит так: если официальный Минск продолжит тесное сотрудничество с Россией, особенно это касается участия в различных военных авантюрах Москвы, то недалек тот час, когда и Беларусь заполучит этот статус. Здесь траектория понятна.

Если вернуться к последствиям для других стран, то те из них, кто до сих пор не готов осудить Россию, но и желает сохранить хорошие отношения с Западом, вынуждены будут серьезно задуматься. Я имею ввиду и африканские государства, и некоторые постсоветские — Азербайджан, например, Армению или Казахстан.

Так как это понятное послание от Запада — этой России никаких послаблений не будет. Ведь какие могут быть компромиссы с террористом?

— Ранее сообщалось, что Европарламент планирует признать террористической организацией ЧВК Вагнера, известную своей активностью не только на территории РФ. Это может усложнить ее деятельность вне границ России?

— Эта компания стала публичной и известной. А те же французы, действующие в ряде стран Африки, воспринимают «вагнеровцев» своими противниками. Признание ЧВК террористической организацией усложнит ей работу в любом случае.

В той же Африке некоторые правительства пользовались ее услугами в своих целях. И часто речь не шла о преследовании интересов России, в большинстве случаев «вагнеровцы» просто зарабатывали деньги. С такой репутацией им это будет делать сложнее. Ведь европейцы оказывают поддержку африканским странам не в последнюю очередь под соусом борьбы с терроризмом. И теперь сотрудничество какого-нибудь африканского правительства с этой ЧВК будет приравниваться к содействию террористам.

Я не думаю, что это повлияет глобально на их деятельность, но сложности у них определенно возникнут. Важно другое: судьба «вагнеровцев» решается не в Африке, вопрос здесь скорее европейский, украинский. Их судьба решается в Украине.

Сергей Василевский
«Филин»

ПАДАТКІ

АСЦЯРОЖНА! ЧАКАЕЦЦА ПАДВЫШЭННЕ ПАДАТКАЎ

Журналісты зрабілі падборку магчымых правак па падатках, якія верагодна будуць у 2023 годзе ў Падатковым кодэксу.



Гаворка ідзе ў тым ліку аб фіксаваным зборы для тых, хто здае ў арэнду нерухомасць, а таксама аб адзіным падатку з ІП і іншых фізічных асоб. Улады таксама хочуць павысіць стаўкі зямельнага падатку. А яшчэ — увесці падатковыя змены для тых, хто трапіў у базу «дармаедаў», а таксама з’ехаў за мяжу.

Удакладнім, што гэтыя магчымыя падатковыя змены яшчэ не прынятыя. Пры гэтым зацверджаны канчатковы варыянт правак чыноўнікаў у Падатковы кодэкс можа адрозніваца ад папярэдніх версій правак у гэты дакумент.

Падатковыя вылікі

У 2023 годзе хочуць перагледзець памеры некаторых падатковых вылікаў, а таксама сумы розных выплат, якія не абкладаюцца падаходным падаткам. Да прыкладу, даходы ад дарэння, якія не абкладаюць падаходным падаткам, прапануецца падняць да 9338 руб-лёў (цяпер — 8078 рублёў). Беларусы могуць атрымаць пэўную суму ў падарунак і не плаціць з яе падаходны падатак. З сумы перавышэння трэба заплаціць падатак па стаўцы 13%, а таксама падаць падатковую дэкларацыю па выніках года.

Таксама прапануецца павялічыць падатковыя вылікі. Да прыкладу, стандартны падатковы вылік пры пэўным узроўні даходу хочуць падняць да 156 рублёў у месяц, калі даход у агульнай суме не перавышае 944 рубля ў месяц (цяпер — 135 і 817 рублёў адпаведна).

Новыя спосабы, як сабраць грошай з «дармаедаў» і тых, хто з’ехаў за мяжу

Чыноўнікі хочуць павысіць стаўкі консульскага збору. Да прыкладу, стаўку за разгляд заявы аб выхадзе з грамадзянства Беларусі хочуць падняць да 400 еўра (цяпер — 250 Еўра).

Плату за рэгістрацыю заключэння шлюбу, уключаючы выдачу пасведчання, плануюць падняць да 100 еўра, а скасавання — 200 еўра. Цяпер — па 50 еўра. Чыноўнікі таксама прыкметна хочуць падняць стаўку за рэгістрацыю перамены прозвішча, уласнага імя і імя па бацьку, уключаючы выдачу пасведчання — да 200 еўра. Цяпер — 70 еўра. За прастаўленне апастылю на афіцыйным дакументе ў дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульствах хочуць спаганяць 50 еўра замест цяперашніх 35.

Чыноўнікі таксама прыдумалі чарговыя змены для «дармаедаў», гэтым разам — падатковыя.

Фактычна можна казаць пра новы падатак, які будуць плаціць тыя, каго ўлады лічаць дармаедамі.

Хочуць павысіць стаўкі акцызаў на алкаголь і цыгарэты

У 2023 годзе таксама плануюць падняць стаўкі акцызаў на алкаголь і цыгарэты. Так, цяпер для першай цэнавай групы цыгарэт стаўка акцызаў складае 43,56 рубля за 1000 штук цыгарэт, а другі — 91,36 рубля.

У праекце зьмяненняў у Падатковы кодэкс прапісалі, што з 1 студзеня 2023 года стаўкі акцызаў для цыгарэт першай цэнавай групы хочуць падняць да 55,6 рубля, з красавіка — да 66,25 рубля, з ліпеня — да 78,97 рубля, а ў кастрычніка — да 95,59 рубля.

Для другой коштавай катэгорыі падвышэнне складзе паэтапна 107,93 рубля (са студзеня), 119,09 рубля (з красавіка), 131,38 рубля (з ліпеня), 147,03 рубля (з кастрычніка).

Гэта значыць стаўкі акцызаў на цыгарэты першай цэнавай катэгорыі могуць вырасці да кастрычніка наступнага года амаль на 120% у параўнанні з цяперашнімі, а другі — прыкладна на 61%.

Праектам правак у Падатковы кодэкс таксама прапануецца падняць стаўкі акцызаў на вадкасці для электронных сістэм — да 0,77 рубля за 1 мл. Нагадаем, з гэтага года яны складаюць 0,15 рубля за 1 мл.

(скарочана)

novychas.online

ГАНДАЛЬ

«ПРИЕЗЖАЮТ ВОВСЕ НЕ ИЗ-ЗА ДЕФИЦИТА ТОВАРОВ»

Экономист Лев Марголин — о том, что может к появлению пустых полок в магазинах в связи с решениями властей в последнее время.

Глава Совета Республики Наталья Кочанова сказала журналистам, что белорусы живут хорошо, в стране нет дефицита товаров и поводов для паники. Наоборот, Лукашенко даже ставит задачу отправлять товары белорусского производства на экспорт, а приезжающие граждане стран Балтии закупаются продуктами питания в Беларуси.

— Отчасти, как ни странно, Кочанова права, — отмечает экономист Лев Марголин в экспресс-комментарии «Салідарнасці». — Оснований для каких-то панических настроений в отношении продуктов питания и товаров первой необходимости нет. По крайне мере, в Минске. Предполагаю, что и в регионах ассортиментный минимум обеспечивается.

Наверное, есть какие-то проблемы: отчасти они зависят от расторопности самих торговцев, отчасти от того, что крупные торговые сети обеспечиваются первоочередно. Но голода нет, и я уверен, его не будет. Беларусь обеспечивает себя основными продуктами на 80-90%.

При этом эксперт допускает, что может быть дефицит не основных продуктов питания, который связан в том числе с новым постановлением регулирования цен.

— Я, например, не знаю, есть ли у нас в магазинах батончики «Сникерс» или «Баунти». Но их действительно может не быть. Во-первых, потому что есть сложности с поставкой, ведь как-никак действуют санкции.

Кроме того, есть проблемы, введенные самим руководством Беларуси. Это искусственно созданные транспортные проблемы, например. А также меры, связанные с ценовым регулированием. Это первое, что может привести к сокращению ассортимента и даже появлению в перспективе пустых полок.

То есть это будет происходить не потому, что каких-то товаров нет в принципе, а потому что ими невыгодно торговать или их невыгодно производить, потому что можно попасть под административную или уголовную ответственность. То же касается и импортных товаров.

Что касается тезиса Кочановой о приезжающих на закупы граждан стран Балтии, то Марголин говорит следующее:

— Здесь, конечно, она немного лукавит. Если они и приезжают, то вовсе не из-за дефицита товаров в своих странах, а потому что у нас некоторые продукты могут быть несколько дешевле, чем у них. В странах с рыночной экономикой люди умеют считать каждую копейку.

Соответственно, ни о каком голоде там речи не идет, как и у нас. Но есть разница в ценах, как и в зарплатах. Если какие-то продукты у нас на 10-20% дешевле, то заработки у нас ниже в два раза.

Катерина Батлейка
gazetaby.info

МАП

«АТАМНАЯ БОМБА» ДЛЯ ЭКАНОМІКІ БЕЛАРУСІ?

Што такое ўласна МАП, яе 33 параграф, і ці так страшны чорт, як яго малююць.



У Беларусі не засталося «адвакатаў» у працоўным руху, у чым вінаватыя ўлады, бо яны ўсіх перасаджалі ўласнымі рукамі. А ў выніку Міжнародная арганізацыя працы ўсё ж такі наважылася ўвесці ў адносінах да нашай краіны 33 параграф свайго статуту. Раней лідар Беларускага кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандр Ярашук параўноўваў гэтае дзеянне МАП з «атамнай бомбай» у дачыненні да краіны. Праўда, такое параўнанне ўжываецца цяпер часцяком — напрыклад, да адключэнні SWIFT. Давайце разбярэмся, што такое ўласна МАП, яе 33 параграф, і ці так страшны чорт, як яго малююць.

1. Не прафсаюз

Міжнародную арганізацыю працы часцяком памылкова ўспрымаюць, як нейкі «сусветны прафсаюз». Насамрэч, гэта зусім не прафсаюз, а структура Арганізацыі Аб'яднаных Нацый — ААН.

Прычым, гэтая ААНаўская ўстанова, як ні дзіўна, старэйшая за саму ААН. МАП была створана ў 1919 годзе як падраздзяленне Лігі Нацый — папярэдніка ААН, і з тых часоў, нават нягледзячы на знікненне Лігі Нацый, не спыняла сваёй дзейнасці.

Вы ўяўляеце, які ў сувязі з гэтым у яе аўтарытэт?

МАП прымае Канвенцыі і рэкамендацыі, прысвечаныя пытанням працы, але наўпрост не можа прымушаць да выканання нават ратыфікаваных канвенцый. У МАП існуюць толькі механізмы кантролю за выкананнем канвенцый і рэкамендацый.

Гэты кантроль ажыццяўляецца Камітэтам экспертаў МАП па ўжыванні канвенцый і рэкамендацый, Камітэтам Адміністрацыйнага савета па свабодзе аб'яднання і Камітэтам канферэнцыі па ўжыванні канвенцый і рэкамендацый. А калі нейкая краіна доўга і паслядоўна не выконвае рэкамендацыі МАП, то МАП звяртаецца да сваіх удзельнікаў (187 дзяржаў) з «просьбай паўплываць» на «адступніка».

Такой паважанай і аўтарытэтнай арганізацыі не вельмі і адкажаш. І ў 2007 годзе за сістэматычнае парушэнне правоў прафсаюзаў Беларусь вылецела з сістэмы гандлёвых прэферэнцый Еўрапейскага саюза. Гэта пазбавіла краіну ад 100 да 300 мільёнаў долараў на год, а зроблена гэта было — на падставе ацэнак МАП.

Яшчэ раз падкрэслім: МАП — гэта не прафсаюз, а вельмі паважаная і ўплывовая структура ААН. І таму яе рашэнні амаль раўназначныя рашэнням ААН. Таму яе рашэнні, як правіла, выконваюцца.

2. Што такое 33 параграф МАП?

Гучыць гэты параграф прыкладна такім чынам: калі якая-небудзь краіна сістэматычна парушае правы працоўных і прафсаюзаў, то МАП мае права прымаць такія рашэнні, якія яна лічыць мэтазгоднымі ў гэтай сітуацыі.

Што гэта будуць за рашэнні — не ведае ніхто. 33 параграф МАП быў прыменены толькі адзін раз за ўсю 102-гадовую гісторыю арганізацыі ў дачыненні да М'янмы (Бірмы), дзе ваенная хунта ланцугамі прыкоўвала работнікаў да працоўнага месца. МАП з дзясятак гадоў уговорвала ваенных у М'янме змяніць гэтую практыку — і ўсё беспаспяхова.

Як казалася вышэй, МАП не можа самастойна накладаць санкцыі, або прымушаць кагосьці нешта выконваць. Але арганізацыя звярнулася да сваіх чальцоў з заклікам спыніць усялякія стасункі з урадам М'янмы.

Паважанай і ўплывовай арганізацыі ніхто не адмовіў. М'янма аказалася ў эканамічнай і палітычнай блакадзе, і хунта даволі хутка «падняла лапы ўгору». Менавіта рашэнне МАП стала пераломным момантам, якое прымусіла ваенных спачатку аднавіць правы працоўных, а потым і пачаць дэмакратычныя пераўтварэнні.

Што тычыцца Беларусі — толькі ўмяшальніцтва незалежных прафсаюзаў не дало ўвесці гэты 33 параграф у дачыненні да нашай краіны ў мінулым годзе. Замест гэтага Сінявокая ў чарговы раз была ўнесеная ў спецпараграф МАП як краіна, дзе груба парушаюцца правы прафсаюзаў.

Унясенне ўрада краіны ў спецпараграф азначае абавязак выпраўлення ўрадам канкрэтных парушэнняў Канвенцыі МАП, указаных у заўвагах Камітэта па ўжыванні нормаў Міжнароднай арганізацыі працы ва ўстаноўлены Камітэтам тэрмін.

Прычым, менавіта кіраўнік БКДП Аляксандр Ярашук настойваў на непрымяненні гэтага параграфа. «Мы, БКДП, міжнародны прафсаюзны рух, палічылі, што ўсе наступствы гэтага радыкальнага рашэння лягуць не на плечы нашай дамарослай хунты, а на плечы грамадзян краіны, у першую чаргу — працоўных. Таму мы вырашылі абмежавацца ўнясеннем Беларусі ў спецыяльны параграф МАП...», — пісаў ён тады ў фэйсбуку.

Замест таго, каб выпраўляць парушэнні Канвенцый МАП, улады пасадзілі Ярашука. І ў МАП, нарэшце, скончылася цярпенне.

3. Што будзе пасля ўжывання 33-га параграфа адносна Беларусі?

Самае цікавае, што наступстваў пакуль не ведае ніхто. Да сакавіка МАП павінна выпрацаваць санкцыйныя меры ў дачыненні да рэжыму Лукашэнкі, а ў чэрвені зацвердзіць іх на канферэнцыі працы.

Некаторыя сцвярджаюць, што прымяненне 33 параграфа фактычна выкрэслівае Беларусь з МАП і блакуе экспарт прадукцыі — таму гавораць пра эканамічныя санкцыі аж да эканамічнай блакады. Іншыя кажуць пра дыпламатычную ізаляцыю на міжнароднай арэне. А ёсць і тыя, хто лічыць, што ў дачыненні да Беларусі наўводзілі столькі санкцый, што прымяненне гэтага артыкула будзе мець выключна маральны эфект.

Наконт апошняга я вельмі сумняюся. Па-першае, МАП — не тая арганізацыя, якая абмяжуецца выражэннем «глыбокай заклапочанасці». Так, яна доўга ўгаворвае, але, калі размовы не дапамагаюць — б'е балюча, і гэта мы бачылі на прыкладзе М'янмы. Па-другое, на месцы ўрада я б вельмі занепакоілася менавіта той самай паўгадавой паўзай для падрыхтоўкі канкрэтных рашэнняў МАП. Гэта азначае, што будуць праанілізаваныя ўсе папярэднія санкцыі, і ўдар будзе нанесены там, дзе гэтых санкцый яшчэ няма.

Па-трэцяе, захады МАП, у адрозненне ад ужо наяўных санкцый, тычацца не толькі «краін развітых дэмакратый». У выпадку з М'янмай да санкцый далучыўся, напрыклад, Кітай. Таму, калі санкцыйныя меры ў дачыненні да Беларусі з боку МАП будуць прынятыя, іх павінны будуць выконваць усе 187 дзяржаў — чальцоў МАП. А гэта і Бразілія, і Венесуэла, і Куба, і Аб'яднаная Арабскія Эміраты, і Ісламская Рэспубліка Іран, і нават Расійская Федэрацыя.

Канешне, наконт апошняй ёсць вялікія сумневы, аднак усе астатнія наўрад ці будуць сварыцца з ААН з-за Беларусі. І ўсе разлікі ўраду на «экспартазамяшчэнне» за кошт краін «дальняй дугі» пойдуць у напрамку рускага ваеннага карабля.

Таму, хутчэй, маюць рацыю тыя, хто кажа пра «эмбарга на экспарт». Дыпламатычная ізаляцыя — таксама верагодная. І ўжо дакладна Сінявокай на бліжэйшую перспектыву давядзецца забыць пра планы ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю.

Санкцыі МАП — «атамная бомба» для эканомікі? Цалкам магчыма. Але што будзе канкрэтна, мы даведаемся праз паўгода.

Таццяна Лісічэнка
novychas.online

Заснавальнік і рэдактар: Гаравы Леанід Антонавіч

Адрас рэдакцыі: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: leo592202@gmail.com
Тэл. 8-02139-5-08-52, маб. + 375(29)6723842 (V),
Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

Падпісана да друку 30.11.2022 у 19.18
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.